УДК 329 (430.1)

*Корзан Д.М.*
***Научный руководитель: д. ист. наук, проф. Стрелец М.В.***

# ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ВКЛ У ЭРУ ВІТАЎТА

Мэтай гэтага дагляду з'яўляецца ажыццяўленне сістэмнай рэканструкцыі ключавых напрамкаў знешняй палітыкі Вялікага князя Літоўскага Вітаўта. Дзеля ажыццяўлення гэтай мэты ў працы былі выкананы наступныя задачы : прасачыць станаўленне Вітаўта як асобы, яго шлях да ўлады ; прааналізаваць адносіны ВКЛ з Масквой і іншымі ўсходнерускімі княствамі у эру Вітаўта; выявіць асаблівасці палітыкі Вітаўта ў дачыненні да краін Заходняй і Усходняй Еўропы. Таксама аўтар спадзяецца , што яго праца будзе спрыяць абуджэнню патрыятычных пачуццяў і цікавасці да гісторыі сваёй Бацькаўшчыны.

Тэма княжання Вітаўта ў ВКЛ з'яўляецца даволі распрацаванай ў навуковай і мастацкай літаратуры. Сучасныя беларуская гістарыяграфія, мастацкая і навукова-папулярная літаратура міфалагізавалі вобраз Вітаўта, зрабіўшы яго сапраўдным нацыянальным героем. Але такая міфалагізацыя хутчэй за ўсё апраўдана з пункту гледжання пазбаўлення комплексу непаўнавартасці, падняцця з кален нацыянальных пачуццяў .

Аднак на нашу думку слаба распрацаваным застаецца пытанне асобы самаго Вітаўта як чалавека, уплыву яго характару на яго дзеянні і ўчынкі. У шматлікіх друкаваных выданнях Вітаўт паўстае як "рыцар без страху і папроку". Але на самой справе і ў Вітаўта , як і ў кожнага чалавека, было нямала сваіх недахопаў. У сувязі з гэтым мы звярнулі асобую ўвагу на асобу і асабістыя якасці вялікага князя Вітаўта , паспрабуем прасачыць, як змяняўся характар Вітаўта з цягам часу , і як лес Вітаўта ўплываў на гэтыя змены , якія ўжо потым ў значнай ступені уплывалі на яго ўчынкі.

У пачатковым перыядзе свайго жыцця Вітаўт яшчэ не меў тых якасцей, якія потым будуць яму вельмі патрэбнымі пры кіраванні Вялікім княствам Літоўскім. Маладому Вітаўту былі ўласцівы высакароднасць, шчырасць, праўдзівасць, ён яшчэ не ведаў хітрыкаў і вераломства. Але на шляху да улады школа жыцця яго чакала не простая. Няпросты быў гэты шлях. Вітаўт страціў шмат блізкіх людзей ; цярпеў шмат здзекаў і прыніжэнняў, адчуў шмат гора і расчараванняў. Быў нават здраднікам і ворагам сваёй дзяржавы( тут маюцца на ўвазе тыя два эпізоды ў жыцці Вітаўта, калі ён двойчы збег да крыжакоў і разам з імі ваяваў супраць сваёй роднай краіны). Шлях да ўлады цалкам змяніў нораў Вітаўта, навучыў яго хітрасці, асцярожнасці, прадбачлівасці. Вітаўт стаў жорсткім чалавекам. Ён набыў усе якасці , неабходныя кіраўніку дзяржавы, і з поспехам выкарыстоўваў іх.

ВКЛ у час панавання Вітаўта праводзіла шматвектарную палітыку. Аб'ектам яе ў розныя часы былі краіны Захаду (Польшча, Чэхія, Свяшчэнная Рымская імперыя) , Поўдня (Залатая Арда , Крымскае ханства) , Поўначы (Тэўтонскі ордэн ) і Усходу (Масква і інш. усходнеславянскія княствы). Спачатку мы разгледзем усходні напрамак знешняй палітыкі Вітаўта.

У 1404 годзе адбылося канчатковае далучэнне да ВКЛ Смаленскага княства, якое займала важнае геапалітычнае становішча і служыла Вітаўту плацдармам дзеля экспансіі на Усход. Пры гэтым Вітаўт абапіраўся на свае здольнасці як паўкаводца, так і дыпламата. Пасля далучэння Смаленскай зямлі Вітаўт вырашыў падначаліць і Пскоў. У 1405 г. ён рушыў на Пскоўскую зямлю, але аблога Пскова была безвыніковай. Вядома, што гэта вайна з Псковам амаль нічога не прынесла Вітаўту. Да таго ж пагоршыліся адносіны і з Масковіяй , якая была незадаволена экспансіяніцкай палітыкай Вітаўта ў дачыненні да Пскова і Ноўгарада.

У выніку ў 1406- 08 гг. адбыліся ваенныя дзеянні паміж Вітаўтам і маскоўскім князем Васілём І. Дарэчы, гэта было бадай адзіным ваенным сутыкненнем паміж ВКЛ і Масквой у час кіравання Вітаўта. Вітаўт здзяйсняе паход , у выніку якога на рацэ Угры быў заключаны мір, па якому ўсходняя мяжа ВКЛ з Масквой праходзіла па рацэ Угры. Хутчэй за ўсё Вітаўт пайшоў на мірнае пагадненне з Масквой кіруючыся тым, што ўжо тады пачалі абвастрацца адносінвы з Тэўтонскім ордэнам, які прагнуў знішчэння ВКЛ і Польшчы і захопу із зямель. Таму на Усходзе быў патрэбен мір.

У 1425 г. памер вялікі князь маскоўскі Васіль І. Перад смерцю ён даручыў Вітаўтуапеку над жонкай Софіяй і сынам Васілем , які потым стане княжыць пад іменем Васіля ІІ. У выніку , Вітаўт атрымаў магчымасць кантролю над падзеямі , што адбываліся ў Маскве. Ён вырашыў выкарыстаць гэтае становішча дзеля новага паходу на Пскоў, што і здзейсніў у 1426 г. Але паход апынуўся надзвычай цяжкім. У выніку Пскоў заплаціў выкуп у 3000 рублеў, і Вітаўт адыйшоў назад. Але Вітаўт не спыняў сваю экспансію на ўсходнерускія княствы. Яго васаламі сталі цвярскі і разанскі князі. Разам з імі ў 1428 г. Вітаўт пайшоў на Ноўгарад.Гэта была самая буйная спроба з боку ВКЛ падначаліць Ноўгарад. На жаль, гэты паход не прынес Вітаўту вялікіх поспехаў. Яго войска ўзяла Себеж, але Порхаў аказваў супраціўленне. Порхаў узяць не ўдалоя, і Вітаўт быў вымушаны здаволіцца тым , што ўзяў выкуп за палоных: 6000 рублёў з Ноўгарада і 5000 з Порхава.

Частку сваёй велізарнай знешнепалітычнай актыўнасці Вітаўт накіроўваў на Усход , імкнучыся ажыццявіць ідэю , якую праводзілі яшчэ Гедымін з Альгердам, - збіральніцтва былых земель Кіеўскай Русі вакол Вільні. Вітаўт дэманстраваў не толькі сваю жорсткасць, як у 1405 г. пры паходзе на Пскоў , але і сваю палітычную дальнабачнасць: у 1408 г. пры заключэнні мірнага пагаднення з Васілём І. Планы Вітаўта цалкам ажыццяўлены не былі, але ён далучыў да ВКЛ Смаленскую, Арлоўскую, Калужскую, Курскую, Тульскую землі. Пры Вітаўце мяжа паміж ВКЛ і Масквой праходзіла ўсходнее Вязьмы, у раёне Мажайску, за 107 вёрст ( каля 114 км ) ад Масквы. Таму намаганні Вітаўта па збіральніцтву ўсходнерускіх княств не былі дарэмнымі.

Хоць Вітаўт і прыкладаў нямалыя намаганні дзеля паспяховага здзяйснення сваёй усходняй палітыкі, усё ж такі ў знешнепалітычных зносінах ВКЛ таго часу пераважалі заходні і паўночна- заходні вектары – адносіны з Ордэнам, Польшчай, Свяшчэннай Рымскай імпэрыяй.

Пасля умацавання сваёй ўлады ў дзяржаве Вітаўт звярнуў ўвагу на Залатую Арду. У канцы 14 ст. яна ўжо не была такой моцнай, як паўтара стагоддзя назад , калі падначаліла сябе амаль усе землі Кіеўскай Русі акрамя сучасных беларускіх. У Ардзе адбываліся шматлікія перавароты, не спыняліся інтрыгі. Гэтую сітуатуцыю Вітаўт палічыў даволі зручнай дзеля ажыцяўлення сваіх знешнепалітычнай планаў. Хан Тахтамыш, які захапіў уладу ў Ардзе з дапамогай сусветна вядомага сярэднявечнага заваёўніка Тамерлана , пачаў супраць таго вайну і пацярпеў паразу .Тады Тахтамыш у 1397 г. уцёк ў Кіеў і запрасіў дапамогі ў Вітаўта. Той з радасцю адклікнуўся. У гісторыі захаваліся наступныя словы Вітаўта да Тахтамыша : "Витовт рече: я тебя посажю на Орде и на Сараи ; и на Болгарах , и на Азтархан, и на Озове, и на Заятцькой Орде , а ты мене посади на Московском великом княжении... и на Новгороде Великом , и на Пскове, а Тферь и Рязань моа и есть, а Немцы и сам возму". Калі ўлічыць тое, што Тахтамыша Вітаўт планаваў выкарыстаць як свайго васала , дык фактычна гэта былі планы па панаванню над паловай Еўразіі. Відавочна , што Вітаўт больш не з'яўляецца тым ізгоем –няўдачнікам, якім ён быў некаторы час да 1392 г. Вітаўт паўстае перад намі ў якасці ўпэўненага ў сваіх сілах ўладара буйнейшай дзяржавы , які не пакутуе ад пачуцця ўласнай абмежаванасці.

Разам з Тахтамышам Вітаўт робіць паспяховыя паходы на Арду, у час аднаго з каторых войска ВКЛ выйшла да берагоў Чорнага мора. Згодна паданню, Вітаўт прыгнуў са скалы ў мора і праплыў палову мілі, звярнуўшыся на бераг. Тым самым ён паказаў, што з гэтага часу Чорнае мора належыць літвінам. Вось якім чынам межы ВКЛ распаўсюдзіліся ад Балтыйскага да Чорнага мора. Але 12 жніўня 1399 г. Вітаўт пацярпеў страшэнную паразу ад татарскіх ханаў Цімура і Эдыгея на рацэ Ворскле.

Падводзячы вынікі бітвы на Ворскле,трэба казаць, што гэта, безумоўна,была страшэнная параза Вітаўта,у выніку якой пацярпелі крах яго планы падпарадкавання вялікіх тэрыторый Усходняй Еўропы і Азіі. Можна толькі гадаць,што было б тады, калі Вітаўт атрымаў бы перамогу. Але гэтага, на вялікі жаль, не адбылося. Аднак гэты правал не спыніў знешнепалітычную актыўнасць уладара ВКЛ. Вітаўт на сваім шляху пераадолеў шмат цяжкасцей,таму яго характар у той час быў ваяўнічы ,і Вітаўт быў не схілены складаць зброю.Усё ж такі яму прыйшлося адкласці рэалізацыю сваіх амбіцый на нейкі час.

Напружанымі былі і адносіны з Ордэнам.У Жамойціі ў 1401 г. пачалося паўстанне супраць крыжакоў ,якое патаемна падтрымліваў Вітаўт .Тады ў 1401-1404 гг..крыжакі здзейснілі некалькі паходаў на ВКЛ.

Паміж Ордэнам і ВКЛ , а асабліва паміж Ордэнам і Польшчай, існавалі шматлікія тэрытарыяльныя спрэчкі.Таму ваеннае сутыкненне паміж Ордэнам і Польшчай было непазбежным. Крыжакі жадалі заручыцца падтрымкай Вітаўта,але той падтрымаў Польшчу. 06.08.1409 г. магістр крыжакоў аб'явіў вайну, грамата аб чым была ўручана Ягайле 15.08.1409 г. Так распачалася "вялікая вайна" 1409-1411 гг. У снежні 1409 г. адбылася сустрэча Вітаўта і Ягайлы ў Берасці, на якой быў распрацаваны план вайны супраць Ордэна. Планавалася аб'яднаным войскам рушыць на сталіцу Ордэна-Мальбарк(Марыенбург) і знішчыць вайсковыя сілы крыжакоў у галоўнай бітве. Увесь час да ліпеня 1410 г. абодва бакі актыўна рыхтаваліся да вайны.

30.06.1410 злучыліся войскі Вітаўта і Ягайлы. На пачатку ваенных дзеянняў крыжакі зрабілі 2 буйныя памылкі: яны дазволілі злучыцца саюзным арміям, а потым і перайсці ім на ордэнскую тэрыторыю, у выніку чаго саюзнікі разрабавалі шмат замкаў і вёсак. 08.07. 1410 саюзнае войска ўторгнулася ў Прусію. 15 ліпеня адбылася адна з найбуйнейшых бітв Сярэднявечча, якая ў нямецкіх хроніках завецца Таненбергскай, у беларускіх летапісах—Дубровенскай, а звычайна—Грундвальскай. Войска саюзнікаў складалася з 91 харугвы: 51- Польшча( сюды ўключаны 7 украінскіх харугв і чэшскія атрады), 40- ВКЛ. Таксама Вітаўту былі падначалены і татарскія атрады. Крыжацкае войска налічвала 51 харугву. Аб колькасці ўдзельнікаў гэтай бітвы з абодвух бакоў ідуць шматлікія спрэчкі, але звычайна лічыцца, што саюзнікі налічвалі 40 тыс. воінаў, а крыжакі—30 тыс. Славяне біліся вельмі мужна, не саступаючы ні кроку. Вітаўт у гэтай бітве прадаманстраваў свае лепшыя якасці: смеласць, мужнасць, вытрымку. Пасля жорсткай сечы саюзнае войска атрымала поўную перамогу. Саюзнікі на адлегласці 25-30 км праследавалі рыцараў. Крыжакі страцілі 18000 забітымі і 14000 палоннымі. Была захоплена ўся іх артылерыя. Саюзнае войска страціла ад 1/3 да 1/5 сваёй колькасці. Вітаўт патрабаваў адразу рушыць на Мальбарк, аднак Ягайла не пагадзіўся з гэтым. У выніку літвінска-польскае войска працягвала па даўнім славянскім звычаю стаяць на полі бітвы яшчэ 3 дні. За гэты час новы магістр крыжакоў Генрых фон Пляўэн паспеў умацаваць сваю сталіцу. Час, каб канчаткова знішчыць Ордэн, быў страчаны. Аднак і без таго крыжакі ўжо не здолеюць аднавіць сваю магутнасць.

У выніку 01.02.1411 г. у Торуні было заключана мірнае пагадненне, па якому да Вітаўта ў пажыццёвае ўладанне адыходзіла Жмудзь(Жамойція), крыжакі павінны былі выплаціць кантрыбуцыю ў 100 тыс. коп пражскіх грошаў, Добжынская зямля адыходзіла да Польшчы, але Памор'е, Кулемская і Міхайлаўская землі заставаліся ў Ордэна.

02.10.1413 г. была падпісана Гарадзельская дамова, якая была дыпламатычнай перамогай Вітаўта, бо яна канчаткова скасоўвала пэўны васалітэт у адносінах ВКЛ да Польшчы, хоць ён ужо даволі даўно быў толькі фармальным.

Тым часам лёс вызначыў Вітаўту стаць чэшскім каралём.Вось як гэта адбылося. Яшчэ ў 1419 г. памёр кароль Чэхіі Венцаслаў, і яго карону ўнаследаваў кіраўнік Свяшчэннай Рымскай імперыі Жыгімонт I Люксембургскі—даўні вораг як Вітаўта , так і Ягайлы. Чэхі паўсталі супраць караля-немца, бо былі незадаволены нямецкім засіллем у Чэхіі. Гэтым паўстаннем кіравалі чэшскія рэфарматыры—гусіты, атрымаўшыя сваю назву ад імені свайго правадыра Яна Гуса. Спачатку чэшскую карону яны прапанавалі Ягайле, але ён баяўся пагаршэння адносін з Жыгімонтам I і адмовіўся ад яе. Тады карона Чэхіі была прапанавана Вітаўту. Той ,канешне, не стаў адмаўляцца ад такога падарунку лёсу.Вялікі князь сам не мог ехаць у Чэхію, таму паслаў туды ў якасці свайго намесніка Жыгімонта Карыбутавіча, унука Альгерда, з 5-тыс.войскам. Відаць, Вітаўт, марыўшы стаць каралём ВКЛ , быў не супраць пабыць некаторы час каралём Чэхіі, тым самым хоць у невялікай ступені ажыццяўляючы сваю запаветную мару. Але хутка сітуацыя змянілася. 27.09.1422 г. быў заключаны мірны дагавор, паводле якога Ордэн адмаўляўся назаўсёды на карысць ВКЛ ад Жамойціі, Судовіі і амаль ад усёй зямлі яцвягаў. З гэтага моманту Жамойція канчаткова ўвайшла ў склад ВКЛ. Папа Марцін V і імператар Жыгімонт I вельмі непрязна ставіліся да Вітаўта з-за таго, што ён падтрымліваў гусітаў. А без іх згоды было нельга здзейсніць запаветную мару Вітаўта—зрабіць ВКЛ каралеўствам. Таму Вітаўт загадаў Жыгімонту Карыбутавічу пакінуць Чэхію.

У цэлым, палітыка Вітаўта ў дачыненні да Тэўтонскага ордэна прынесла яму вялікія поспехі. Ордэн быў амаль знішчаны, шмат зямель , якія знаходзіліся некаторы час пад уладай крыжакоў , было далучана да ВКЛ. Пасля перамог над Ордэнам Вітаўт атрымаў шмат славы па ўсёй Еўропе .

У дачыненні да Залатой Арды Вітаўт яшчэ ў 1411 г. здзейсніў туды пераможны паход , пасля якога назначыў яе кіраўнікам хана Джэлаладзіна. Пасля гэтага амаль увесь час да смерці Вітаўта ў Ардзе ўладарылі яго стаўленнікі. Вітаўт супрацьстаўляў адных татарскіх ханаў другім , не даючы нікому з іх узвысіцца.

20-ыя гады XV ст. з'яўляюцца вяршыняй магутнасці Вітаўта. Ён трымае моцную ўладу ў сваёй дзяржаве, мае свайго намесніка ў Чэхіі, у Ноўгарадзе, у Разані, у Залатой Ардзе. Вітаўт мае вялікі ўплыў на справы ў Маскве, Польшчы, Валахіі, Мазовіі. Яму шлюць падарункі англійскі кароль і візантыйскі імператар .Каб сцешыць славалюбства Вітаўта не хапала толькі літвінскай кароны. І Вітаўт , насуперак палякам , робіць пэўныя крокі , каб здзейсніць сваю мэту.

На студзень 1429 г. планаваўся з'езд у Луцку , на якім адным з пытанняў павінна было разглядацца і пытанне аб каранацыі Вітаўта. Але па прычыне супраціўлення палякаў на чале з Ягайлай, мару Вітаўта ажыццявіць не ўдалося.

Між тым імператар Жыгімонт I паслаў Вітаўту карону. Аднак палякі паставілі атрады на мяжы , і паслы імператара не змаглі праехаць. Вітаўт да канца жыцця спадзяваўся на ажыццяўленне сваёй мэты, але калі ён ехаў на коні ў Трокі , здарыўся такі выпадак. Вітаўт нечакана адчуў сябе дрэнна і ўпаў з сядла, атрымаўшы пры гэтым моцныя пашкоджанні. **27.10.1430** г. памёр вялікі князь Вітаўт. Так скончыў сваё жыццё Вітаўт Вялікі.

Вось такім быў залаты век нашай гісторыі, звязаны з іменем Вітаўта. У гэтай працы знайшоў сваё адлюстраванне ўвесь працяглы перыяд жыцця Вітаўта, было даследавана, якім чынам змяняўся характар самаго Вітаўта пад уплывам розных падзей. Мэты яго знешняй палітыкі ў дачыненні да ўсходнерускіх зямель цалкам ажыццяўлены не былі, але ўсё ж ён дасягнуў і ў гэтым напрамку значных поспехаў. Яго палітыка ў дачыненні да краін Усходняй і Заходняй Еўропы была яшчэ больш паспяховай. Ён быў сынам свайго часу і карыстаўся сродкамі, уласцівымі той эпохе. Аднак Вітаўт рабіў амаль усе свае ўчынкі, асабліва ў другой палове свайго жыцця , кіруючыся інтарэсамі дзяржавы. Вітаўт шмат зрабіў дзеля магутнасці і славы нашай дзяржавы, за што заслугоўвае ад нашчадкаў вялікай пашаны.